**Урок 29, дата_____ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ 4 КЛАС**

**Тэма: Абагульняючы ўрок па тэме “Чалавек, слова і кніга”**
**Мэты:**

- ✔ падагуліць і замацаваць веды вучняў па пройдзеным раздзеле;
- ✔ развіваць чытацкую цікавасць да твораў аб сваіх каранях;
- ✔ фарміраваць навык работы ў групах і парах;
- ✔ фарміраваць уменне адказваць на тэсты;
- ✔ развіваць маўленне, механізм чытання па-беларуску;
- ✔ імкнуцца акрэсліць асаблівасці беларускай мовы;
- ✔ выхоўваць беражлівае станаўленне да роднай мовы.

**Абсталяванне**: падручнік, сшытак

## ХОД УРОКА

## I. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ МОМАНТ

## II. ПРАВЕРКА Д/ЗАДАННЯ

Выразнае чытанне верша

-Якія пачуцці перадае гэты верш?
-Якія малюнкі можна намаляваць да гэтага верша?
-Чым устравожаны паэт?
-Ці раздзяляеце вы яго думку? Чаму?
-Чаму аўтар называе беларускую мову мовай Скарыны і Талаша?
-Як вы разумееце выразы: “*каб цэлы свет не здаўся вузкім”, “абсяг бароў былінных і поля мудрая душа”*?
-Прачытайце, з кім і з чым аўтар параўноўвае родную мову?
-Якімі словамі пераконвае любіць мову? Прачытайце.

## III. РАБОТА ПА ТЭМЕ ЎРОКА

-Сення ў нас заключны ўрок па тэме “Чалавек, слова і кніга”. Растлумачце назву раздзела.
-Што аб’ядзнае творы, якія мы прайшлі за гэты час?
-Якая мова з’яўляецца для нас роднай?
-Чаму мы лічым роднымі дзве мовы?

**Работа над творамі**

**1. Работа ў парах**

Запоўні табліцу. Запаўняючы апошні слупок, карыстайся словамі для даведак. Параўнай словы першага і другога слупкоў і адкажы на пытанне: на якой мове іх утварэнне лягчэй раз- гадаць — на рускай ці на беларускай?

| *Па-беларуску* | *Па-руску* | *Утварэнне* |
|---|---|---|
| верасень | | |
| ліпень | | |
| надвор’е | | |
| назоўнік | | |

| | | |
|---|---|---|
| сякера | | |

<u>**Словы для даведак**</u>: называе прадметы, штосьці сячы, на двары, цвіце ліпа, цвіце верас.

<u>Аб’яднай прозвішча аўтара з назвай твора, які ён напісаў</u>:

*А. Вольскі* *“Роднае слова”*
*К. Цвірка* *“Чаму?”*
*А. Станюк* *“ У кнігарні”*

**2. “Любіце мову”** (работа ў групах)
Запішы насупраць выказвання нумар слупка, у якім пра гэта гаворыцца.

- *У мове адлюстраваны вопыт жыцця, назапашаны стагоддзямі.*
- *Паэт папярэджвае нас пра адказнасць перад будучымі пакаленнямі за захаванасць беларускай мовы.*
- *Трэба ведаць і любіць мову, каб цябе паважалі людзі.*
- *Аўтар нагадвае, што трэба ганарыцца мовай, на якой размаўлялі знакамітыя асветнікі, народ- ныя героі шмат стагоддзяў таму.*
- *Без мовы чалавек не можа жыць.*
- *Беларуская мова дазваляе трапна, з душой апі- саць веліч, прыгажосць беларускай прыроды.*
- *Як ты мяркуеш, ці можна зрабіць так, каб кожны беларус мог свабодна размаўляць па-бела- руску не на ўроках у школе, а ў паўсядзённым жыцці?*

-Які з твораў раздзела вам асабліва запомнўся? Чаму?
-Чаму вучыць казка А.Вольскага “Роднае слова”?

**3. Праверачная работа**
Работа з тэстам.

**4. Творчая работа**
Работа з загадкамі (<u>*ст.102*</u>).

**ІУ. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ УРОКА. РЭФЛЕКСІЯ**

- Які раздзел мы абагульнялі сення?
- Разгледзьце фотаздымкі помнікаў кнігам (<u>*ст.101*</u>). Чаму людзі ў розных краінах вырашылі ўшанаваць іх менавіта так?
-А які помнік кнігі вы прапанавалі паставіць у нашым горадзе?

**У. ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ**

***Праэкт помніка кнігі.***

*ТЭСТ*

**1. Дапоўні назву вывучанага раздзела**

Чалавек, ……………… і кніга.

**2. Аб’яднай творы з атрыманымі табой з гэтых твораў звесткамі**

| | |
|---|---|
| Ты даведаўся, адкуль з’явіліся словы гасцінец, дарога, акно, жыта, бульба і іншыя | **А. Вольскі “Роднае слова”** |
| Ты даведаўся, што ў кожнага народа ёсць свая родная мова, якую трэба любіць і шанаваць | **А. Станюк “Чаму?”** |

**3. Якая прыказка адпавядае галоўнай думцы вывучанага раздела? Абвядзі літару правільнага адказа**

А) Новых сяброў набывай, а старых не забывай.

Б) Добрая кніга – лепшы сябр.

В) Лянівы за работы – мазоль за руку.

**4. Выбяры радок, у якім указаны беларускія паэты:**

А) А. Пушкін, А. Барто. С. Міхалкоў

Б) Л. Дайнека, К Цвірка, У. Карызна, Я. Колас

В) А. Вольскі, У. Ліпскі, В. Драгунскі

**5. Аб’яднай стрэлкамі словы з іх тлумачэннем**

| | |
|---|---|
| ганьбіць | даць у доўг |
| цурацца | зневажаць |
| пазычыць | адракацца |

*<u>Ст.99-100</u>*